УДК 37.046.14

***А. Л. Кацько***
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# ДА ПЫТАННЯ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ ДА РАБОТЫ З НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНАЙ У АДУКАЦЫЙНА-ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ

**Анатацыя.** Разглядаюцца некаторыя аспекты ўдасканалення падрыхтоўкі педагагічных кадраў у кантэксце арыентацый у адукацыйным працэсе на нацыянальныя традыцыі. Тлумачыцца роля культурна-гістарычнай спадчыны, значэнне пераемнасці пакаленняў. Раскрываецца сутнасць педагагічных умоў, якія забяспечваюць эфектыўнасць падрыхтоўкі студэнтаў у дадзеным накірунку.

**Ключавыя словы:** традыцыя, культура, пераемнасць пакаленняў, нацыянальная культурна-гістарычная спадчына, педагагічны працэс, падрыхтоўка будучых педагогаў.

## Уводзіны

На сучасным этапе ва ўмовах духоўнага адраджэння грамадства, росту яго нацыянальнай самасвядомасці востра паўстала пытанне аб неабходнасці гуманізацыі адукацыйнага працэсу, яго адкрытасці культуры, якая дае духоўна-каштоўнасныя арыентацыі падрастаючаму пакаленню. Гэта абумоўлена не толькі кардынальнымі зменамі, якія адбываюцца ў нашай краіне, але і павышэннем значнасці суб’ектыўнага фактару ў развіцці грамадства. Таму невыпадкова ў педагагічнай навуцы павялічваецца цікавасць да нацыянальнай самасвядомасці, звяртаецца ўвага на адраджэнне народных традыцый, развіццё і разуменне ролі сваёй нацыі, этнасу ў сусветным гістарычным працэсе.

## Асноўная частка

Спадчына кожнага народа змяшчае ў сабе каштоўныя ідэі і вопыт выхавання, што з’яўляецца вызначальным у станаўленні асноў характару і выпрацоўцы нормаў паводзін людзей, якія шмат у чым залежаць ад сацыяльнага асяроддзя.

Традыцыі — трывала ўсталяваныя формы паводзін людзей і іх прынцыпы, якія атрыманы ад папярэдніх пакаленняў і па якіх развіваецца агульначалавечая культура.

Рэпазіторый БарДУ

Распаўсюджана меркаванне, што тлумачыць традыцыю ў вузкім значэнні як спадчыну мінулага, якая не з’яўляецца зменлівай, гнуткай [3]. Традыцыя — дынамічны працэс перадачы духоўных каштоўнасцей і нормаў ад пакалення да пакалення. Яна выступае ў якасці фактара, які арганізуе ўзаемадзеянне чалавека са светам, з іншымі людзьмі, з самім сабой. Традыцыя шмат у чым вызначае фарміраванне светапогляду, арганізуе жыццё чалавека ў прадметнай, прыроднай, сацыяльнай і знакавай рэаліях.

Школа ўключана ў агульныя механізмы трансляцыі культуры. Гэта значыць, што школа з’яўляецца не толькі часткай традыцыі, але і яе носьбітам. Акрамя таго, у сваёй унутранай арганізацыі яна фарміруе ўласныя традыцыі, якія функцыяніруюць па тых жа заканамернасцях, што і механізмы трансляцыі культуры.

З усіх традыцый, якія ўплываюць на фарміраванне асобы, асаблівую ролю навукоўцы адводзяць выхаваўчым традыцыям. Л. І. Бажовіч, Л. С. Выгоцкі сцвярджалі, што развіццё чалавека ажыццяўляецца праз засваенне ім усяго папярэдняга вопыту культуры. Традыцыі арганізуюць сувязь і пераемнасць пакаленняў, на іх трымаецца духоўна-маральнае жыццё народаў. Традыцыя садзейнічае аднаўленню спадчыны. Таму так важна выпрацаваць у будучага педагога павагу да нацыянальнай культурна-гістарычнай спадчыны, пазітыўнае да яе стаўленне, жаданне падтрымліваць яе і захоўваць.

У працэсе выхавання моладзі агульнаадукацыйная школа адыгрывае вядучую ролю, яна з’яўляецца своеасаблівым сацыякультурным інстытутам, які ўключае ў сябе і рознаўзроставыя культурныя нормы і традыцыі розных пластоў культуры: кніжнай, масавай, арганізацыйнай (традыцыі адукацыйнай сістэмы), уласна школьных (уклад школы), прафесійных субкультур, узроставых субкультур і інш. Носьбітамі гэтых культурных традыцый выступаюць усе ўдзельнікі педагагічнага працэсу, але кіруючая і арганізуючая роля належыць у першую чаргу настаўнікам. Менавіта таму пытанні ўдасканалення падрыхтоўкі педагагічных кадраў набываюць у цяперашні час асаблівую актуальнасць.

Існуе шмат педагагічных даследаванняў, прысвечаных пытанням прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў да розных відаў



Рэпазіторый БарДУ

дзейнасці. Сярод іх адзначым працы вучоных-педагогаў Н. В. Кузьміной [1; 2], В. А. Сласцёніна [4; 5], Л. Б. Шчарбаковай [7] і інш., у якіх даследаваны пазнавальныя, арганізатарскія і даследчыя кірункі работы са студэнтамі.

Адной з найважнейшых задач пры падрыхтоўцы будучых настаўнікаў з'яўляецца закладванне асноў духоўна-маральнай асобы з актыўнай жыццёвай пазіцыяй і з творчым патэнцыялам, развіццё здольнасці да самаўдасканалення, да гарманічнага ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі.

Аднак значная частка выпускнікоў педагагічных устаноў вышэйшай адукацыі не валодае дастатковымі ведамі і ўменнямі для выкарыстання сістэмы нацыянальнай культурнай спадчыны і не праяўляе цікавасці да яе. Гэта робіць праблему ўдасканалення падрыхтоўкі студэнтаў да працы ў дадзеным накірунку асабліва важнай.

У задачу падрыхтоўкі будучага педагога ў кантэксце дадзенай праблемы ўваходзіць здольнасць навучыцца прагназаваць і рэалізоўваць патэнцыял нацыянальных традыцый, звычаяў у навучальна-выхаваўчым працэсе; дапамагчы выхаваць цікавасць да роднай культуры і навучыцца ўсведамляць сябе як носьбіта гэтай культуры.

Работа па выкарыстанні сістэмы нацыянальнай культурнай спадчыны пры падрыхтоўцы будучых настаўнікаў павінна ажыццяўляцца ў трох кірунках:

– інфармацыйная напаўняльнасць (паведамленне пра традыцыі, звычаі, спецыфіку нацыянальнай культуры і каштоўнасцей і г. д.);

– эмацыянальнае ўздзеянне (падчас рэалізацыі першага кірунку — інфармацыйнага насычэння — важна выклікаць водгук у душы студэнта);

– нормы паводзін (веды, атрыманыя студэнтам пра нормы ўзаемаадносін паміж народамі, правілы этыкету, павінны быць абавязкова замацаваныя ў яго ўласных паводзінах) [6].

Такім чынам, адной з задач пры падрыхтоўцы будучых настаўнікаў з'яўляецца закладванне асноў духоўна-маральнай асобы з актыўнай жыццёвай пазіцыяй і з творчым патэнцыялам, здольнай да самаўдасканалення, да гарманічнага ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі. У адпаведнасці з гэтым неабходна выявіць

Репозиторий БарГУ

шляхі і ўмовы, якія дазволяць павялічыць эфектыўнасць працы са студэнтамі ў рамках дадзенага напрамку.

Эфектыўнасць падрыхтоўкі студэнтаў да выкарыстання сістэмы культурна-гістарычнай спадчыны ў працэсе выхавання навучэнцаў забяспечваецца рэалізацыяй педагагічных умоў, якія ўключаюць:

– спалучэнне розных стымулаў, якія падахвочваюць да актыўнай навучальна-пазнавальнай дзейнасці ў час падрыхтоўкі;

– выкарыстанне разнастайных формаў правядзення заняткаў, што спрыяе развіццю цікавасці да падзей, якія адбываліся ў мінулым і ў цяперашні час, да патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення;

– развіццё матываванасці навучальнай дзейнасці навучэнцаў падчас падрыхтоўкі;

– стварэнне атмасферы эмацыянальнага ўздыму ў час работы;

– забеспячэнне сувязі пры выкладанні агульнапедагагічных і спецыяльных дысцыплін;

– арганізацыя спецыяльных заняткаў па педагагічнай тэхніцы;

– спалучэнне розных відаў дзейнасці навучэнцаў ў час падрыхтоўкі;

– забеспячэнне пераемнасці падрыхтоўкі на ўсіх этапах і ўзроўнях;

– выкарыстанне выхаваўчых магчымасцей розных грамадскіх інстытутаў.

Забеспячэнне студэнтаў ведамі складае аснову падрыхтоўкі, але без практычнага ўжывання гэтыя веды застануцца бескарыснымі, таму у змест падрыхтоўкі ўключаецца таксама фарміраванне такіх уменняў і навыкаў, як дыдактычныя, выхаваўчыя, даследчыя ўменні, а таксама інтэгральныя, «скразныя» педагагічныя ўменні (арганізацыйныя, дыягнастычныя, канструктыўныя, камунікатыўныя, уменні педагагічнай тэхнікі).

**Заключэнне**

Такім чынам, як мы бачым, падрыхтоўка будучых настаўнікаў у межах акрэсленага кірунку звязана, перш за усё, з пошукам новых спосабаў сумеснай творчай дзейнасці выкладчыка і студэнта, а не з усталяваннем нейкіх агульных рэцэптаў арганізацыі агульнакультурнай падрыхтоўкі.

Репозиторий БарГУ

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Кузьмина, Н. В.* Методологические проблемы вузовской педагогики / *Н. В. Кузьмина, С. А. Тихомиров* // Проблемы педагогики высшей школы. — Л. : Знание,1972. — 90 с.

2. *Кузьмина, Н. В.* Очерки психологии труда учителей : Психологическая структура деятельности учителя и формирование его личности / Н. В. Кузьмина. — Л : Изд-во Ленинград. ун-та, 1967. — 182 с.

3. *Лурье, С. В.* Историческая этнология / С. В. Лурье. — М. : [б. и.], 1997. —242 с.

4. *Сластёнин, В. А.* Реформа школы и готовность учителя к профессиональной деятельности / В. А. Сластёнин, М. А. Виленский // Теория и практика физич. культуры. — 1985. — № 6. — С. 43—54.

5. *Сластёнин, В. А.* Формирование личности учителя советской школы в процессе профессиональной подготовки / В. А. Сластёнин. — М. : Просвещение, 1976. — 160 с.

6. *Харисов, Ф. Ф.* Интеграция национальной культуры и учебно-воспитательного процесса : автореф. ... дис. д-ра пед. наук : 13.00.01 / Ф. Ф. Харисов. — Элиста, 1999. — 39 с.

7. *Щербакова, Л. Б.* Подготовка студентов педвузов к изучению и использованию передового педагогического опыта: дис. ... канд. пед. наук / Л. Б. Щербакова. — Минск : [б. и.], 1990. — 177 с.

Материал поступил в редколлегию 31.01.2012.

УДК 378.01(075.8)

***Ю. А. Маскалевич***
Учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет им. М. Танка», Минск

# ФОРМИРОВАНИЕ ПРОГНОСТИЧЕСКИХ И ПРОЕКТИВНЫХ УМЕНИЙ БУДУЩИХ СОЦИАЛЬНЫХ ПЕДАГОГОВ КАК КОМПОНЕНТА ПЕДАГОГИЧЕСКОГО МАСТЕРСТВА

**Аннотация.** Рассматриваются особенности формирования прогностических и проективных умений будущих социальных педагогов в процессе их профессиональной подготовки. Представлены сущность прогностических и проективных умений как компонента педагогического мастерства, определена структура проекта и основные знания и умения, которыми должны овладеть будущие специалисты в процессе преподавания дисциплины «Проектирование социально-педагогической деятельности».

**Ключевые слова:** прогностические умения, проективные умения, педагогическая компетентность, проектирование, педагогическое прогнозирование, проект.

Репозиторий БарГУ